.

Сумко А.В.
(*Рэспубліка Беларусь, г. Наваполацк*)

ЛЁН У СІСТЭМЕ ЖЫЦЦЕЗАБЕСПЯЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ПАСЛЯВАЕННАЙ ВЁСКІ

Вяскоўцы, узгадваючы пра паўсядзённасць пасля Вялікай Айчыннай вайны, адзначалі, што асабістая гаспадарка дазваляла дасягнуць пэўнай ступені вытворчай аўтаномнасці. Яна забяспечвала прадуктамі харчавання, сыравінай. Побач са збожжавымі ў структуры пасеваў важную ролю адыгрываў лён, які меў стратэгічнае значэнне для жыццязабеспячэння вясковай сям'і. Матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што ва ўмовах пасляваеннай разрухі дадзеная культура актыўна выкарыстоўвалася ў якасці гаспадарчага і харчовага рэсурса як у сялян-аднаасобнікаў, так і ў сялян-калгаснікаў.

У першыя паваенныя гады надзённай праблемай стала аднаўленне ўласнай сядзібы і стварэнне прыймальных жыццёвых умоў, дзеля чаго выкарыстоўваліся ўсе наяўныя рэсурсы. Архіўныя матэрыялы і ўспаміны сведкаў паказваюць, што не хапала самых элементарных рэчаў, асабліва актуальна гэта было для раёнаў, якія сталі эпіцэнтрам спусташальных карных экспедыцый нацыстаў. "Вот не было нічога, нічога не было, хадзілі так, у лахманах, якія былі" [1]. Забеспячэнне адзеннем было актуальнай праблемай, асабліва ў першыя гады пасля вызвалення. Архіўныя справы, у першую чаргу партыйных фондаў, утрымліваюць шматлікія заявы са зваротамі аб дапамозе: "Я са сваёй сям'ёй была

ў партызанах. Калі адходзілі ў партызаны, што было, то засталося дома. Усё адзенне і маёмасць разграблена фашысцкімі слугамі. Цяпер калі вярнулася з лесу з дзяцьмі, то засталася зусім голая. Надыходзіць вучэбны год. Дзецям трэба ісці ў школу. Яны босыя і голыя. Адправіць у школу няма ў чым. Прашу хоць трохі адзежы…" [2]. Звычайна такія заявы адпраўляліся спачатку ў сельсаветы, а затым у раённыя партыйныя камітэты. І калі праблемы з недахопам прадуктаў харчавання мелі варыятыўнае рашэнне, то сітуацыя з адзеннем была значна складаней, бо не было фондаў і магчымасці дапамагчы, што адлюстроўвалася ў адказах на звароты. У такіх умовах у вясковым асяроддзі адбывалася актуалізацыя традыцыйных практык жыццезабеспячэння.

Палявыя матэрыялы фіксуюць, што распаўсюджанай практыкай стала вяртанне да самаробнага абутку і даматканага адзення, для вытворчасці якога асноўным матэрыялам з'яўляўся лён. Успаміны рэспандэнтаў пра пасляваенную рэчаіснасць сведчаць, што найбольш пашыранай гэта з'ява была сярод сялян-аднаасобнікаў з раёнаў, якія ў міжваенны час уваходзілі ў Польшчу. "[Пасля вайны ці вырошчвалі лён? Ці ткалі з яго?]. – Да! А мы ж адзеваліся. Вырашчвалі лён, мялі, бялілі. Палатно ж у каждага дома. Гэта ж болей па хутарах. А там не адно палатно, а там многа – трубкі былі. І рушнікі былі, і настольнікі…" (Міёрскі р-н) [3]; "Са льну рабілі. Лён жа сеялі на сотках, у лазьні мялі і трапалі, і шчоткай часалі. І настольнікі былі, і пасцель, усё кужэльнае, тканае з лёну. І адзяваліся толька сваім – льняным. Наўлечкі былі ільняныя, у клетачку, харошыя тканыя. Лён сеялі, усё сваё было" (Браслаўскі р-н) [4].

Рэспандэнты, якія нарадзіліся ў Заходняй Беларусі, падрабязна распавядалі пра тэхналогію перапрацоўкі льну, сведкамі якой яны былі ў паваенным дзяцінстве. Напрыклад, адзін з рэспандэнтаў узгадваў наступнае: "…помню дзедушка вот лён сеяў, патом гэтат лён таксама слалі, абдзіралі. У кулі такія рвалі жанчыны, а тады ж нада была іх звязці і галоўкі гэты абрэзаць. І аставаліся толькі лыткі лёну, вот гэтат лён абдзіралі, а патом яго мачылі, помню ў дзедушкі там дажэ тры ці чатыры былі стаўкі, ну сажалкі тады называліся, і вот гэтат лён сколькі ён там мок, я не помню, но настаяшча. Тады яго выцягвалі такім багром і жанчыны яго мокры сразу рассцілалі, ну там дзе па пастбішчы, патом сколькі ён там лежаў, ужо дзедушка пойдзець, еслі кастра асыпаецца, тады яго нада было ўжо падымаць. І вязалі зноў у кулькі і ставілі, а патом у восеці яго сушылі. Такая пастройка была, там печ такая агромная, унізу там неяк у зямлі ў палу…лён састаўлялі ў гэтай пастройцы і тапілі гэту печку – лён сушылі. Патом этат лён мялі, такая машына, такая бальшая і тры валы, ну так яны круціліся па-разнаму, валы гэтыя такімі зубамі…ну быў прывод на вуліцы, там каня запрагалі, конь гэтат ездзіў, круціў гэтат прывод, гэта машына работала, круцілася, а лён – там чалавек сядзеў, яму падавалі гэтыя жменькі лёну і ён кідаў, гэта дужа апасная работа была. Патаму што лён круціцца, яго нада выхваціць і зноў кінуць, а там пылішча такое! Страх адзін! …калі ён ужо змяты, тады яго трэпалі, бралі жменьку і такія лапатачкі дзеравянныя былі здзеланы, даволі длінныя, а тут ціпа пахожы на нож, толькі што яны бальшыя эты лапатачк. Вот трапалі-трапалі-збівалі. Тады связывалі ў такія, як бы цюкі. Гэта ўжо на прадажу лён, а еслі сабе, тады яго яшчо чэсалі, былі такія шчоткі – на даску набіта гвоздзяў. На прадажу толькі абтрапаны, а эта ўжо нада было выцягаць гэта ўсё, і кужаль гэты аставаўся, ну як валасы чалавечаскія, еслі лён дробненькі, дык ён такі мяканькі. Дык гэты кужаль рассцілалі на стол, помню вот так мама рукамі, разасланы, мячыць, каб ён такі пухлы стаў, ну і вот у кудзеліну скручывалі і на прасніцу" (Міёрскі р-н) [5]. Разам з гэтым, палявыя матэрыялы сведчаць, што кардынальныя змены ў жыцці селяніна-аднаасобніка ў канцы 1940-х гадоў адбіліся і на тэхналогіі перапрацоўкі, і на маштабе пасеваў культуры ва ўласных гаспадарках. Мялкі былі абагульнены, а памеры сядзібы скарочаны. "Тады ж эта ўсё разабралі. У калхоз абагулівалі. Каму нада была мялка тая? Там яна ў калхозе і згніла. Пасля вайны мы дужа і не ткалі кужаль. Лёну не было ж ужо свайго. [Вы ж казалі, што і после вайны ткалі, была і бялізна, і пасцельнае?] А, ну да. Дык гэта, што было здзелана яшчэ, када людзі жылі самастаяцельна на сваёй зямлі, а пасля ж у нас ужо ў 48 гаду калхоз" (Міёрскі р-н) [5];

“Тут землямеры мералі ўсю восень, усю вясну гэтыя нівы. Затое, што ўся зямля па-другому пайшла” (Глыбоцкі р-н) [6]. Аднак, трэба адзначыць, што працэс калектывізацыі і ступень супраціву ў розных раёнах мелі сваю працягласць. Па ўспамінах некаторых рэспандэнтаў, лён працягвалі па традыцыі сеяць на ўласнай сядзібе да пачатку 1950-х гадоў. “Яго як зробіш, так ён палучаецца рыжы такі. Як мяць станеш, так ён пад залацісты цвет палучаўся, такі красівы, аж блясціць валакно, такое красівае – гэты самы первы сорт. Былі часалкі, часалі і такія звязвалі, а тады як прасці як нажы счосвалі, рабіліся такія харошыя, як пух…вычэсвалі такія роўненькія, красівыя рабіліся. Вот тады прасніца, на пасніцу прыціскаеш, абкручваеш і сядзіш…мама за прасніцай, а крылот, называлі крылот, і нагой круціш, а рукамі перабірае тоненечка, каб на самы первы сорт і яна так тоненька прала і з гэтага ўжо кашулю шылі, дзецям шылі, простыні… выбельвалі, тады неяк у ваду мачылі і пранікамі білі, білі, патом расцілалі на поле. Вот работы было. [А в какое время это делалось?] Это шчытай пад 50-я гады. Лен паспее пад восень. А за зіму ўсё гэта рабілі” (Маладзечанскі р-н) [7]. Неабходнасць гэтай культуры ў севазвароце нават ва ўмовах скарачэнне ворыўнай зямлі тлумачылася самімі рэспандэнтамі наступным чынам “надо было собрать деньги и расчытацца с налогом… Я даже в самотканой куртке поехала учиться, в 52-м гаду… потому что материала купить на пальто не было, а во-вторых у нас и денег не было…” (Міёрскі р-н) [8].

Аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі паказвае, што выкарыстанне лёну ў паваеннай сістэме жыццезабеспячэння ў якасці харчовага і гаспадарчага рэсурса было распаўсюджана і ва ўсходніх раёнах Беларусі ў асяроддзі сялян-калгаснікаў. “Мы жылі бедна-бедна. Самадзельнае ўсё такое, адзёжа, абутак. Мама прала і бабушка прала. Пралі ў тры калаўроты. Мама прала кужаль, а бабушка прала такое зрэб’е, каторае вычосваецца, када лён гэты, калі кужаль чэшаць шчоткай, вычэсваецца такое пакулле. Самае грубае пакулле ішло на вяроўкі, мужчыны вілі вяроўкі ўсякія, у хазяйстве нада было всегда вяроўка. Так гэтае пакулле, грубае самае, вілі вяроўкі, а мы тады ўжо пралі” (Верхнядзвінскі р-н) [9]. Пры гэтым неабходна адзначыць, што лён бралі пераважна з калгасу: “[А вы лён сеялі ці з калгаса?] З калгаса бралі. Ой, после вайны мама і кудзель…, знаете па кускам, відзіма, сабіралі і дзелалі кросны, ну і ткалі. [Мама пасля вайны станок вастанавіла?] Да. Да. Нада было і рубашку якую, пасцельнае, палаценца – гэта ўсё харошае, мягкае такое” (Верхнядзвінскі р-н) [10]; “Лён. Усё з лёну рабілі. [А лён мама на сваёй зямлі садзіла, каля дома?] Быў у калхозе лён і бралі, і нам давалі. Дома ж ніхто не сеяў лён” (Дзяржынскі р-н) [11]. У залежнасці ад сітуацыі лён мог выдавацца за працадні, але сустракаліся выпадкі, калі калгасны лён дабываўся нелегальна: “[А дзе той лён пасадзіш? Калхозе?] У калхозе кралі трошку, падкрадуць, дзе ў бане сушуць. Ну, троху падкрадалі” (Ушацкі р-н) [12]. Некаторыя рэспандэнты ўзгадвалі, што лён бацькі садзілі ў межах уласнай сядзібы: “Зямлі мало было. Усё ж картошка і сеялі, і лён трэба пасеяць, каб быў свой…[А пасля вайны лён тожа садзілі на сваём участке?] Саділі. Самі для сябе ткалі, пралі. А дзе ж узяць? Ткалі. Яго парвуць, пасушаць, а тады пасцелюць, тады збяруць. Сушылі ў банях, на церніцу цёрлі, а тады абдзіралі яго, кужаль аддзельна, атрэп’е аддзельна і пралі. З кужаля ўжо ж ткалі самыя такія харошыя пасцілкі, рушнікі. А з гэтага атрэп’я, як называлі, ужо палавікі сталі ткаць, палатно гэтае рабілі больш таўсцейшае. Вілі вяроўкі” (Пухавіцкі р-н) [13].

Успаміны вяскоўцаў фіксуюць, что лён выкарыстоўваўся не толькі як сыравіна для ткацтва, але і як харчовы рэсурс. У пасляваенным рацыёне прысутнічаў алей з ільнянога семя: “[Постнае масла з чаго делалі?] Са льна. Спецыяльныя такія. У нас дзядзька быў адзін і людзі к нему насілі,ён выжымаў камнямі какімі-та…з нашай дзярэўні” [14]; “[А на чым смажылі?] Быў жа лён, а поснае ж масла, эта неяк ціснулі, камяні нейкія, нешта робілі, малолі, такое вот укуснае поснае масла..” [12]. Іншы раз не звярталіся да спецыяліста, а проста таўклі льняное семя і елі з бульбай.

Такім чынам, матэрыялы вуснай гісторыі сведчаць пра тое, што ў перыяд пасляваеннага аднаўлення, ва ўмовах неспрыяльнай эканамічнай сітуацыі, лён меў

стратэгічнае значэнне для жыццязабеспячэння вясковай сям’і і актыўна выкарыстоўваўся ў якасці харчовага і гаспадарчага рэсурса як у сялян-аднаасобнікаў, так і ў сялян-калгаснікаў.

Літаратура

1. Запісана ў 2020 г. ад Ж., 1933 г. н., в. Мажуйкі Ушацкага р-на.
2. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 2-п. – Воп. 1. – Спр. 6. – Л. 35.
3. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1928 г. н., в. Узмёны Міёрскага р-на.
4. Запісана ў 2018 г. ад Ж., 1927 г. н., в. Ёдлавічы Браслаўскага р-на.
5. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1931 г. н., в Узмёны Міёрскага р-на.
6. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1929 г. н. в. Верхнія Глыбоцкага р-на; в. Верацеі Пастаўскага р-на.
7. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1938 г. н., в. Асавец Маладзечанскага р-на.
8. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1936 г. н. в. Паташня Міёрскага р-на; в. Жыгулі Верхнядзвінскага р-на.
9. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1932 г. н., в. Барсукі Верхнядзвінскага р-на.
10. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1930 г. н., в. Первамайскае Верхнядзвінскага р-на.
11. Запісана ў 2022 г. ад Ж., 1939 г. н., в. Данілавічы Дзяржынскага р-на.
12. Запісана ў 2021 г. ад Ж., 1930 г. н., в. Кублічы Ушацкага р-на.
13. Запісана ў 2022 г. ад Ж., 1938 г. н., в. Блонь Пухавіцкага р-на.
14. Запісана ў 2022 г. ад Ж., 1937 г. н. в. Старая Падвалушка, Бярэзінскага р-на, Мінск.

З мэтай захавання прыватнасці асабістых дадзеных прыводзяцца толькі ініцыялы рэспандэнтаў і пазначаецца пол: Ж – жанчына, М – мужчына. Запісы захоўваюцца ў Цэнтры вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама ў асабістым архіве аўтара.